**18 лютага — 70 год з дня нараджэння В. І. Казлова (1903—1967), партыйнага і дзяржаўнага дзеяча БССР**

Васіль Іванавіч Казлоў нарадзіўся ў вёсцы Заграддзе на Гомельшчыне ў беднай сялянскай сям'і. Сваю працоўную дзейнасць пачаў чатырнаццацігадовым хлапчуком рамонтнікам на чыгуначным транспарце. Уступіўшы ў 1927 годзе ў члены КПСС, ён назаўсёды звязаў свой лёс з Ленінскай партыяй. Пасля заканчэння ў 1933 годзе Камуністычнага ўніверсітэта імя Леніна у Мінску В. І. Казлоў поўнасцю аддаецца практычнай рабоце на ажыццяўленню сацыялістычных пераўтварэнняў у вёсцы. Ён узначальвае машынна-трактарную станцыю, кіруе Старобінскай і Чэрвеньскай раённымі партыйнымі арганізацыямі. З 1940 года Васіль Іванавіч — на адказнай пасадзе намесніка Старшыні Савета Народных Камісараў БССР. Праз год камуністы Мінскай абласной партыйнай арганізацыі выбіраюць яго другім сакратаром абласнога камітэта партыі. У гады Вялікай Айчыннай вайны Казлоў па рашэнню ЦК КП Беларусі знаходзіўся ў тыле ворага ў якасці першага сакратара Мінскага падпольнага абкома партыі. Ён узначальваў адно з буйнейшых у рэспубліцы партызанскіх злучэнняў і праявіў сябе як выдатны кіраўнік партызанскага руху. З яго імем звязаны многія слаўныя старонкі летапісу герайчнай барацьбы народных мсціўцаў. У 1943 годзе Казлову было прысвоена воінскае званне генерал-маёра.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў Васіль Іванавіч узначальваў Мінскую абласную і гарадскую партыйныя арганізацыі, а з 1948 года нязменна каля дваццаці гадоў працаваў Старшынёй

Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

На XX і XXII з'ездах КПСС выбіраўся кандыдатам, а на XXIII з'ездзе — членам ЦК КПСС. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (2—7 скліканняў).

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ